# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ І ВЫХАВАННЕ МОЛАДЗІ

Грыбау Г.М.
г. Брэст, БГІІ

Добра вядома ісціна, калі не вырашаны агульныя пытанні, заўсёды наткнешся на іх нявырашанасць у справах канкрэтных. Выхаванне маладога пакалення не можа быць паспяховым, калі мы не будзем ведаць, што выхоўваць. У савецкія часы ўсё было зразумела. Існавала афіцыйная ідэалогія, і яе дагматы вызначалі асноўныя мэты, змест выхавання, яго напрамкі, метады і формы . У сучасны момант сітуацыя змянілася. Хоць і не вельмі актыўна, але ідзе пошук новых ідэалагічных арыенціраў і прынцыпаў. Трэба адзначыць, што наша грамадства яшчэ не вызначылася ў гэтым пошуку і бясспрэчнай сістэмы ідэалагічных асноў не акрэсліла. Толькі дзве ідэі ў гэтым накірунку былі выказаны больш-менш безумоўна. Першая – гэта заклік абапірацца на хрысціянскія каштоўнасці, другая – дэклараванне тэзіса аб вострай патрэбе народа ў нацыянальнай ідэі.

Трэба адзначыць, што тэрмін "ідэалогія" многіх палохае. Ён часта атаясамліваецца з камуністычным мінулым, нагадвае аб двурушнай прапагандзе, нецярпімасці да іншадумства, барацьбе з так званай "буржуазнасцю", напамінае аб дагматызме і коснасці. І калі ў сучасны момант у нас будзе ізноў сфарміравана афіцыйная дзяржаўная ідэалагічная сістэма, то рэцыдываў мінулага, відаць, не ўдасца пазбегнуць. Людзі, не згодныя з афіцыйнай версіяй , будуць заўсёды. Значыцца, у нас ізноў могуць з'явіцца дысідэнты, а вольнадумства можна будзе праследаваць па закону. Як гаворыцца, мы гэта ужо праходзілі.

Класічнае вызначэнне ідэалогіі – сістэма поглядаў на прыроду, грамадства і асобу, а таксама каштоўнасцей і норм, адлюстроўваючых інтарэсы класа і грамадства. Гэта сукупнасць філасофскіх, палітычных, эканамічных, рэлігійных і іншых ідэй. Гэта шматаспектная тэорыя, распрацаваная спецыялістамі розных накірункаў грамадазнаўства. Магчыма, тэрмін "нацыянальная ідэя" больш прыймальны, хоць у сутнасці паміж імі няма істотнага адрознення. Беларускую нацыянальную ідэю таксама можна разглядаць з шматбаковых пазіцый: гістарычных, філасофскіх, геапалітычных, паліталагічных, культуралагічных, маральна-эстэтычных, экалагічных, юрыдычных, эканамічных і іншых.

Нацыянальная ідэя часта выступае і як лаканічны тэзіс, які аб'ядноўвае увесь народ той ці іншай краіны, альбо яго пераважную большасць. Гэта лозунг, які выражае карэнны інтарэс нацыі ў канкрэтны гістарычны момант яе

існавання. Калі звярнуцца да гістарычных прыкладаў, то гэта імкненне народа Ірана пазбавіцца тыраніі шаха Р.Пехлеві, гэта прага народаў былых савецкіх прыбалтыйскіх рэспублік аднавіць статус незалежнай дзяржавы з арыентацыяй развіцця на Захад і многія іншыя прыклады. Нам здаецца, што прыймальным з'яуляецца таксама выраз "базісныя каштоўнасці" народа, дзяржавы.

Распрацаваць сістэму поглядаў, адэкватна адлюстроўваючых інтарэсы нацыі, гэта нялёгкая справа. Яна можа быць выпрацана мазгавым цэнтрам, які абапіраецца на распрацоўкі мноства спецыялістаў. Вынікам гэтай тытанічнай работы можа быць чарговы ідэалагічны монстр, штучна народжанае стварэнне тэарэтыкаў, затраціўшых сілы на фарміраванне чарговага міфа, які не "ляжа на душу" народа, ізноў будзе абвергнуты жыццём.

Але што будзе прадстаўляць сабою нацыянальная ідэя, калі яна будзе кіраваць масавую свядомасць большасці народа? Паспрабуем даць гэтай свядомасці кароткую характарыстыку. Якія рысы для яе характэрны?

1. Неразвіты ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, непавага да беларускай мовы, культуры і гісторыі, нацыянальны нігілізм. Згодна апошняму перапісу насельніцтва ,у нашай дзяржаве пражываюць 81 % беларусаў, але толькі 41 % размаўляюць дома на роднай мове. Трэба дадаць, што на чыстай літаратурнай беларускай мове размаўляе шмат меньш насельніцтва, большасць карыстаецца так званай "трасянкай".
2. Адсутнасць разумення, што дзяржаўны суверэнітэт – гэта вялікая каштоўнасць, неразуменне таго, што можна разумна і эфектыўна выкарыстаць магчымасці і перавагі, якія ён дае. Успомнім, як мы атрымалі нашу дзяржаўную незалежнасць. Яна не была вынікам мэтанакіраванай барацьбы народа, яна была следствам распаду СССР. Кіраўнікі трох рэспублік падпісалі у Віскулях дамову і народу паведамілі, што ўсе мы сталі грамадзянамі незалежнай Беларусі. І навіна гэта, гістарычная па сутнасці, была успрынята надзвычайна спакойна. Ні мітынгаў пратэсту, ні масавага захаплення з гэтай нагоды мы не назіралі. Напрошваецца наступнае меркаванне Аднойчы уверсе будзе прынята супрацьлеглае рашэнне, і наша незалежная дзяржава ізноў перастане існаваць. Асмелімся дапусціць, што асноўнай часткай насельніцтва гэта змяненне будзе успрынята з такім жа раўнадушшам і абыякавасцю. Калі незалежнасць не вынік барацьбы , а прадукт распаду, і калі людзі да гэтага часу так і не адчулі матэрыяльных выгод суверэнітэта, то такая і яго цана.

У сучасны момант улады Беларусі настойліва імкнуцца паэтапна рэалізаваць ідэю "адзінай" дзяржавы з Расійскай Федэрацыяй. Адносіны да

гэтай палітычнай акцыі розныя. Афіцыйныя структуры сцвярджаюць , што пры гэтым суверэнітэт краіны захаваецца, апазіцыя лічыць гэта стратай незалежнасці. На наш погляд, практычныя крокі па стварэнню адзінай з Расіяй дзяржавы не вельмі пасуюць да заклiка аб фарміраванні нацыянальнай ідэі.

3. З сказанага вышэй лагічна выводзіцца наступная асаблівасць грамадскай свядомасці нашага народу. Гэта палітычная інфантыльнасць, нявер`е ні ў якія ідэі, тэорыі, партыі, дэмакратыю і рэформы.
4. Бязмежнае маўчалівае цярпенне і падпарадкаванне акалічнасцям жыцця, якое пагоршваецца, талерантнасць, якая мяжуе з адсутнасцю самапавагі, памяркоўнасць, напамінаючая пакорнасць любой зменлівасці лёсу.
5. Комплекс непаўнацэннасці, слабая вера ў свае сілы і бытуючае меркаванне, што Беларусь абавязкова павінна з кім- небудзь злучыцца, зліцца, а сама па сабе яна існаваць не можа. А паколькі” у Еўропе нас не чакаюць”, застаецца толькі адно – “разам з Расіяй” Другія варыянты быццам не існуюць.
6. Палітычная, грамадзянская пасіўнасць, феномен чакання цуда. Жыццё наладзіцца, стане заможным, калі чаканы дабрабыт прынясе цудатворца, моцная асоба, Расія, якая дасць нам танныя энерганосьбіты, ці “Захад нам дапаможа”. Амаль усе спадзяюцца, што хтосці, а не сам беларус, забяспечыць яму належнае жыццё.
7. Нізкая прававая культура, прававы нігілізм. Наш чалавек, і просты ггрconsiderable грамадзянін, і кіруючая асоба, не прывык строга падпарадкавацца закону.

Калі абагульніць вышэй прыведзеныя характэрныя, на наш погляд, рысы менталітэта нашага сярэднестатыстычнага грамадзяніна, а потым адэкватна адлюстраваць іх у нацыянальнай ідэі, каб яна “лягла на яго душу”, то якая ж, у такім выпадку, атрымаецца гэта самая ідэя? Толькі сістэма поглядаў, узвышаных над звычайнай свядомасцю абывацеля, арыенціруючых на будучае, на сацыяльны прагрэс, мае права называцца ёю. Распрацаваць гэту ідэю павінны тыя, хто глядзіць уперад, хто здольны бачыць далей, разумець глыбей і думаць не толькі пра дзень сённяшні, але і аб тым, у якім грамадстве будуць жыць нашы нашчадкі.

Якія базісныя каштоўнасці могуць скласці ядро нацыянальнай ідэі народа Беларусі? Перш за ўсе трэба памятаць, што беларускія землі, якія знаходзяцца паміж Усходам і Захадам, адчувалі на сабе ўздзеянне то заходнееўрапейскай, то рускай культуры. Наш народ - еўрапейская нацыя, і для яго не з’яўляюцца непрыймальнымі ідэалы заходнееўрапейскага тыпу. Пагэтаму ў палітычнай сферы арыенцірам для нас павінен быць не аўтарытарны варыянт дзяржаўнага ўладкавання, а праверaны на вопыце

многіх краін дэмакратычны тып грамадства. Гэта бясспрэчна, нягледзячы на выказванні, што мы, маўляў, не дараслі да свабоды, што палітычная культура народу нізкая, і ён справядліва абазваў гэту форму кіравання "дерьмократией", якая ў нашых умовах неэфектыўна.

У эканамічнай сферы таксама няма патрэбы вынаходзіць веласіпед. На вопыце краін і Еўропы, і Азіі даказана, што толькі ўласнік, а не чыноўнік, здольны ўмела выкарыстаць уласнасць, здабыць з яе максімум карысці сабе і грамадству.

І, нарэшце, у духоўнай сферы арыенцірам для нашага чалавека могуць быць хрысціянскія маральныя каштоўнасці. Падсумуем вышэйсказанае і коратка абрысуем асноўны змест нацыянальнай ідэі.

1. Выкараненне комплексу непаўнацэннасці, выхаванне нацыянальнай самапавагі, разумення бязмежнай каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту.
2. Вынішчэнне рабскай псіхалогіі і фарміраванне пачуцця асабістай годнасці кожнага грамадзяніна .
3. Вызваленне ад нацыянальнага нігілізму і выхаванне павагі да гісторыі, культуры народа Беларусі і беларускай мовы
4. Пераадоленне грамадскай пасіўнасці і абыякавасці, фарміраванне пераканання, што народ Беларусі сам можа і павінен уладкаваць дабрабыт і прыстойнае жыццё ў сваёй краіне.
5. Усведамленне таго, што ў дзяржаве, у якой пануе закон сілы, а не сіла закону, ніколі не будзе справядлівасці, парадку і багацця.
6. Эканамічны росквіт, дынамічнае развіццё гаспадаркі немагчымы без цывілізаваных рыначных адносін, свабоды прадпрымальніцтва і раўнапраўя розных форм уласнасці.

*Шкада, канешне, што наш народ не мае развітай нацыянальнай свядомасці, але калі сістэма выхавання будзе мэтанакіравана фарміраваць яе, сітуацыя паступова зменіцца. Прыйдуць новыя пакаленні, якія пазбавяцца ад гэтага недахопу. Акцэнт на беларускасць асабліва патрэбны ва ўмовах інтэграцыйных працэсаў. Краіны Еўрасаюза усё цясней зближаюцца ў эканамічнай і палітычнай сферы, але пры гэтым вельмі рэўнасна імкнуцца захаваць нацыянальную самабытнасць, стараюцца развіваць і аберагаць нацыянальную мову і культуру.*